# ЛІНГВАКУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ ПАДЫХОД У РАЗВІЦЦІ БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ ДАШКОЛЬНІКАЎ

***Юнюшкіна С. Ю.*** *(УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік –*** *Н. А. Барысенка, канд. філал. навук, дацэнт*

Унікальнае значэнне ў станаўленні асобы мае родная мова, якая адначасова з'яўляецца нацыянальнай мовай твайго народа. Дашкольны ўзрост найбольш спрыяльны для актыўнага маўленчага развіцця дзіцяці. У гэты час адбываецца фарміраванне вуснай мовы і навыкаў маўленчых зносін. Аднак дзіця, якое жыве ў грамадстве, дзе актыўна функцыянуюць дзве дзяржаўныя мовы (руская і беларуская), сутыкаецца з праблемай двухмоўя. Гэта азначае, што акрамя мовы, на якой размаўляюць бацькі і суседзі, а таксама вядзецца адукацыйны працэс ва ўстанове дашкольнай адукацыі, маленькі грамадзянін на працягу свайго жыцця павінен засвоіць другую мову. На жаль, для вялікай колькасці дзяцей другой мовай з'яўляецца беларуская. Найчасцей гэтай мовай дзеці авалодваюць не ў сям'і і не ў працэсе актыўных зносін з блізкімі людзьмі, а ва ўмовах спецыяльна арганізаванай дзейнасці. Таму актуальным уяўляецца пытанння аб пошуку эфектыўных метадаў і пры емаў фарміравання ў дашкольнай установе нацыянальнай самасвядомасці, перадачы літаратурнай спадчыны, культурных традыцый, назапашаных беларускім народам, з выкарыстаннем лінгвакультуралагічнага падыходу .

Адным з напрамкаў лінгвакультуралагічнага падыходу ў развіцці беларускага маўлення з'яўляецца назапашванне лексічнага матэрыялу этнаграфічнага зместу. Такім матэрыялам могуць быць каляндарна-абрадавыя тэксты. У артыкуле разгледзім, як можа быць арганізавана такая праца.



МГПУ им. И.П.Шамякина

У гадавым плане дашкольнай установы  есць пастаянная тэма «Азнаямленне дзяцей з нацыянальнай культурай». Для рэалізацыі задач, прадугледжаных названай тэмай змяняюцца знешнія ўмовы ў групавым пакоі ў «беларускамоўны дзень»; у кожнай групе арганізаваны цэнтр літаратурна-мастацкай дзейнасці, дзе дзеці могуць пазна еміцца з цікавымі кнігамі на беларускай мове: пра Беларусь, пра знакамітых людзей нашай краіны; створаны ўмовы для правядзення літаратурных, дыдактычных, сюжэтна-ролевых гульняў «Бібліятэка», «Кніжная крама». У кожнай групе арганізаваны беларускі куток, у якім размешчаны матэрыял пра Мазыр, пра знакамітых людзей Мазыршчыны, змешчаны стэнд з гімнам, гербам і сцягам рэспублікі, вырабы з саломкі, з гліны, беларускія лялькі, сурвэткі і інш.

Адзін з выхаваўчых сродкаў, які дазваляе актывізаваць нацыянальныя інтарэсы дзяцей і ўвесці іх у беларускамоўнае асяроддзе, – народныя святы і абрады. Яны наладжваюцца з дзецьмі старэйшага дашкольнага ўзросту. Зразумела, не ўсе аспекты святаў і абрадаў беларускага народа даступныя дашкольнікам, таму разам з музычным кіраўніком выбіраюцца тыя, у якіх дзеці могуць прыняць паўнацэнны ўдзел. Дарослыя выконваюць у народных святах і абрадах вядучую ролю, а малыя маюць магчымасць спяваць, скакаць, ладзіць гульні і г.д. У святах прымаюць актыўны удзел і бацькі. Так, напрыклад, перш чым арганізаваць свята “Калядкі”, праводзіцца папярэдняя работа з дзецьмі і дарослымі, падбіраецца матэрыял, даступны для дзяцей дашкольнага ўзросту, выконваюцца розныя атрыбуты, ствараюцца касцюмы, упрыгожваюцца групы і музычны зал.

Папярэдне з дзецьмі праводзіцца гутарка пра гісторыю свята, што трэба рабіць у гэтае свята, як нашы дзядулі і бабулі адзначалі яго. Затым разам з музычным кіраўніком і бацькамі падбіраецца абсталяванне і ўпрыгожваецца зала. Гэта можа быць макет вясковай хаты, зроблены сумесна з бацькамі, стол з абрусам, на стале размяшчаецца гліняны посуд з ежай, драўляная лаўка, музычныя інструменты.

Да правядзення самога свята з дзецьмі развучваюцца беларускія народныя песні, гульні, калядкі. Таксама выбіраюцца дзеючыя асобы, як правіла, дарослыя: выхавацелі, кіраўнік фізічнага выхавання або бацькі. Сам працэс падрыхтоўкі вельмі цікавы дзецям. Яны самастойна прыдумваюць сабе касцюмы (з дапамогай дарослых), робяць маскі, завучваюць абрадавыя песні. Дзеці з бацькамі ствараюць калядную зорку.

Калі пачынаецца свята, дзеці, падыходзячы да залы, спяваюць калядкі. Гаспадыня з гаспадаром сустракаюць калядоўшчыкаў на парозе і запрашаюць іх у госці. Але, перш чым калядаваць, гаспадыня і гаспадар прапануюць калядоўшчыкам папрацаваць. Разам з калядоўшчыкамі прыйшоў і мядзведзь.  Ён першым пачынае калядаваць. Гаспадыня гаворыць мядзведзю, што выхаванцы вельмі таленавітыя: ўмеюць танцаваць, спяваць, іграць на музычных інструментах. Дашкаляты разам з гаспадыняй і гаспадаром танцуюць беларускі народны танец “Лявоніха”. Пасля ў госці заходзіць яшчэ адна дзеючая асоба – цыганка, якая ўмее варажыць. Яна варожыць гаспадыні і калядоўшчыкам. Пасля варажбы праводзіцца беларуская народная гульня “Падушачка”.

Такім чынам, вышэй апісаная сістэма работы па далучэнні дашкольнікаў да нацыянальных традыцый беларускага народа на занятках па развіццю беларускага маўлення і культуры маўленчых зносін дае пазітыўныя вынікі: актыўна папаўняецца слоўнікавы запас дзяцей дашкольнага ўзросту, удасканальваюцца навыкі дыялагічнага і маналагічнага маўлення. Акрамя гэтага, лінгвакультуралагічны падыход у развіцці беларускага маўлення дашкольнікаў, абапіраючыся на этнаграфічны матэрыял, дазваляе адначасова паспяхова вырашаць задачы патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення.

МГПУ им. И.П.Шамякина